Вось так яно і было. У гэтым горадзе пра Нястрашны лес ведалі мала — і ўсё блытана-перablытана. Ведалі, што там растуць суніцы. Што зямля ў сякіх-такіх месцах дрогкая і хлюпае ды правальваецца. І ўсё, што маленькае, можа рабіцца вялікім, а вялікае — маленькім. І што жывуць там вадзяныя цудзёнкі-сцюдзёнкі і камарыныя багі. І што ёсць там дрэвы, якія ходзяць, і ландышы, якія граюць з вятрамі званочкавыя пералівы. І што жыве ў Круглым возеры агнярыб з падвойным хвастом і чырвонай луской — рыба колеру густой-густой медзі. І рак, і шчупак, і гаючы гарлачык, і рапуха, яго ахоўніца... Усё было тут да месца і ўсё ведала, што да чаго. Грыб знаў грыбныя запаветы, арліца — як ладкаваць гнёзды, глушэц, птах чуйны, крычаў перад світаннем і танцаваў танец кахання.

А неба залятала сюды адпачыць. Засне часам у мяккіх травах і песціцца да раніцы, пакуль пугач не гукне тройчы. Тады неба назад спяшаецца, світанак сустракаць і частаваць гарбатаю золак.

А як жа тут раніцай мякка і прытульна! У нізкіх аблоках можна схавацца і чакаць. Звычайна чакае-чакае неба, усё не можа дачакацца. Тут, ні адсюль ні адтуль, — янот-паласкун. І з ім птушка Дыф. І што ведае яна — тое не скажа. А як ужо скажа — то гаспадыні ў панчоху. І там таямніцу схавае.

Так і жылі горад і лес, кожны сам сабе, пакуль горад не прачнуўся ад вялікага пылу — і не стаў чхаць. І тады пачалі клікаць жаўранка...

* * *

...І вось уранку жаўранак заспяваў, спрабуючы, што з гэтага атрымаецца. Але панавалі шум горада, і пыл, і сухія бульвары, і глыбы камяніцаў, даўно абчасаныя невядомымі майстрамі...

Спрабаваў да ночы. І ў цемры таксама спрабаваў прарвацца да неба. І стала ціха — і чутно. Гэта Вялікае Вуха спусцілася да зямлі і ўсыпіла грукат. Густы доўгі пралог — новая эра наступнага дня.





***

Стук, стук... Гэта велікан посахам абмацвае горы, вітае ўзгоркі і авечак на ўзгорках. Перакатваецца пярэстая чарада праз седлавіну перавалу ў далёкія ўгоддзі. І стары Чабан у кучаравай бурцы — уладарны ахоўнік авечак, заўсёды пільны і вечны, як скалы.

З гары выйшаў Дух, пыхнуў люлькай — і паляцелі камяні-валуны і вогненныя булавы. Вось табе і пыл-попел!

Прыцíснуліся да зямлі пастуховыя сабакі. Прачнуўся і ўсміхнуўся далёкай песні жаўранка трохгаловы Трытон, крылаты і кіпцюрасты, і вынес таямнічы скарб гномаў-ахоўнікаў. І надзеў на галаву карону.

І замерла ўсё раптам. І лінула з неба, і свет умыўся і прыслухаўся. У арэхавай калысцы на сямі нітках загайдаўся новы час.

І ўсміхнуўся Нястрашны лес, і над Круглым возерам узняўся каляровы туман.

А жаўранак усё спяваў.

І ўвесь свет слухаў ягоную песню.

***

Знайшоў Чабан пад вялізнай яблыняй двух немаўлят, што смакталі пярэстую авечку. Адна ў статку была такая шматколерная і заўсёды хадзіла скраю. Яна ж і гаспадара паклікала — такім перарывістым бляяннем, амаль песняй.

Былі гэта хлопчык і дзяўчынка, загорнутыя ў палатно. На ручках у іх было па тонкім бранзалецiку. Яшчэ пры іх былі жалудовыя пацеркі, дудачка і калябаса — невялікі выдзеўбаны і высушаны гарбуз з чарадзейнымі зярняткамі. І частка гэтых зярнятак была нібы пясчынкі, а частка — як буйная грэчка. Усе яны былі самых розных адценняў, і водар ад іх ішоў тонкі і неаднолькавы.

Чабан узяў малых сабе, а пярэстая авечка іх выкарміла. Раслі дзеткі вясёлымі і рухавымі, і вось ужо напоўніцу дапамагалі пасвіць атару.

А калі было ім па сем гадоў, знайшлі яны тую самую калябасу з зярняткамі і спыталі ў бацькі:

— Што гэта так цудоўна пахне?

Чабан сказаў:

— У той дзень, калі я знайшоў вас, было з вамі колькі цікавых рэчаў. І сярод іх гэты посуд з невядомым зернем. Я вырашыў: станеце вялікімі — разам і вырасцім зярняты.

— Так! Так! — закрычала дзяўчынка. — Давай іх пасеем, татка.

— Я тады прыгледзеў дзве невялічкія палянкі і пачаў даглядаць іх. Цяпер прыйшоў час пасеяць насенне.

І раскідалі яны тыя зернейкі, што былі як пясчынкі, на палянцы пад вялікім каменем, а тыя, што як грэчка, — ля вірлівага ручая.

***

Прачнуўся гарлачык і ўздрыгнуў! Прыйшла да яго вестка, што ЯНА ўжо нарадзілася, і падрасла, і пасеяла цуды, і ўжо хутка ўсходы. Смяяўся вецер, што прынёс тую вестку. І вербы ўсміхаліся і паласкалі ў вадзе доўгія галіны.

А птушкі пракрычалі, што ўжо нарадзіўся Прынц, і падрос, і раскідаў зерне — і хутка яно ўзыдзе.

А імёны іхнія — Юна і Юн, што азначае Світанак і Ноч.

— Хутка пачнецца, — прашамкала старая рапуха і нырнула з ліста.

— Хутка пачнецца!!! — разнеслася па ўсім падводным царстве, і ўсё Круглае возера прыйшло ў рух, усе воды і падводныя жыхары пасміхнуліся і падміргнулі адно аднаму. І ўсе дрэвы прашамацелі і далёка-далёка перадалі вестку, і птушкі доўга дзяліліся сваімі ранішнімі пошчакамі з усім светам.

***

І на той палянцы, што пад вялікім каменем, выраслі кветкі, шматколерныя і відушчыя — дзеці ўсмешкі. Было там незлічона адценняў, і ўранку яны былі адны, а ўначы — іншыя. І ўсё гэта пералівалася і грала.

А на той палянцы, што ля вірлівага ручая, вырасла вялізнае лісце на дужых сцёблах і цягнулася да неба.

Прайшло некалькі тыдняў, і са смехатлівых кветак вылецелі матылькі і стракозы, а да ночы павыпаўзалі разнастайныя светлякі.

А ў буйным лісці збудавалі гнёзды птушкі і кажаны. Унізе ўзышлі гарбузовыя парасткі, а бліжэй да сонца з’явіліся вострыя чырвоныя перцы. І ў цені гэтых вялікіх крылатых раслін нават у спёку былі свежасць і прахалода.

Аднойчы выйшла з ручая прыгажуня панна ў зорнай накідцы, села на вялікі камень, абхапіла каленкі і стала чакаць.

Уранку прыбеглі дзеці, прынеслі ёй суніц і авечага малака.

І стала яна прыходзіць часта і прыносіла з сабою ўсялякія чароўныя ракавінкі ды карэньчыкі, а аднойчы прынесла старую кнігу.





— Што гэта? — спыталі дзеці.

— Гэта Кніга шчасця, — сказала панна, якая была рачной феяй.

— Мы не ўмеем чытаць, — разам сказалі дзеці. — Што ж цяпер будзе?

— Я навучу вас, — адказала панна.

І яна навучыла іх чытаць, разбіраць знакі, слухаць птушак, і звяроў, і кузурак, і вецер. І пакуль пастух ганяў чараду па бязмежных узгорках, да зімы дзеці ўжо многае ведалі з Кнігі шчасця і многае мелі апавесці тату, калі ён вернецца дадому.

Зіма ў даліне была мяккая, і ўсё ж матылькі схаваліся, стракозы зладзілі гнёзды, а кажаны прымасціліся пад страхой у доме. А птушкі падаліся ў вырай, каб вярнуцца ўвесну.

У дзяцей было шмат гарбузочкаў і перачных стручкоў, увесь гэты ўраджай вісеў пад столлю вялізнымі гірляндамі. І месца гэтае палюбілася светлячкам, якія вырашылі зімаваць на тых гушкалках. Калі ноччу раптам расплюшчыш вочы — зробіцца вельмі-вельмі незвычайна і радасна.

Узімку, калі тата прыганяў атару ў даліну, брат і сястра многа расказвалі яму з Кнігі шчасця. І разам яны радаваліся цудоўнаму ўраджаю і авечкам, якіх стала больш, рабілі цёплыя рэчы з іх воўны, гатавалі пярцовую гарбату, ласаваліся мёдам з цудоўных кветак.

А бацька расказваў ім пра горы, і пра начныя спевы ваўкоў, і пра арліцу, якую ён уратаваў, калі тая была яшчэ арляняткам, і з якой яны сябруюць ужо шмат гадоў.

А з воўны пярэстай авечкі-карміцелькі спляла сабе Юна лёгкую сукенку, Юну — цёплую шапачку-каўпачок, а тату — гетры. І калі Юн граў на той самай дудачцы, каўпачок падыгрываў яму, а матылькі танчылі свае лятучыя танцы. А жалудовыя пацеркі былі Юне аздобай.

Час брата і сястры яшчэ даспяваў у арэхавай шкарлупінцы на сямі тонкіх нітках.

***

Ды вось аднойчы ў далёкай цясніне за Вялікім перавалам пацягнуліся авечкі ў зялёныя лугі. Яны схаваліся ад навальніцы ў пячору і пайшлі па яе лабірынтах, аб'ядаючы на сценах незвычайныя смачныя парасткі. Чабан з сабакамі пайшлі за імі. І больш іх ніхто не бачыў.

Усю зіму дзеці чакалі вестак ад таты — і цішыня. Не стукае посах аб камень, не чутно бляяння шумлівай атары. Не брэшуць сабакі.